УДК 821.161.3 «1920/1930»

**І. У. Каляда**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# КУЛЬТУРНА-ПАЛІТЫЧНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ (1920-Я ГАДЫ)

У артыкуле разглядаюцца пытанні правядзення нацыянальнай палітыкі, вядомай як беларусізацыя, прычыны звяртання да яе, асноўныя накірункі, адносіны да гэтай з’явы насельніцтва. Вытокі беларусізацыі – у разгортванні беларускага нацыянальнага руху, які пачынаўся як культурна-этнаграфічны, у праграмных палажэннях нацыянальных партый, у пошуку форм нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, што адбываўся ў сутыкненні розных поглядаў і меркаванняў. Сваю ролю тут адыграла і з’яўленне беларускага перыядычнага друку, дзейнасць урада БНР, абвяшчэнне БССР. У 1920-я гады беларусізацыя набыла статус дзяржаўнай палітыкі.

**Ключавыя словы**: палітыка беларусізацыі, беларускі нацыянальны рух, перыядычны друк, дзяржаўная палітыка, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва, беларускае насельніцтва.

**I. U. Kolyada**
Belarusian State Technological University

# CULTURAL-POLITICAL PRECONDITIONS BELARUSIZATION (1920S)

The article deals with the issues of the national policy known as Belarusization, the reasons for the appeal to it, the main directions, the attitude to this phenomenon of the population. The origins of Belarus-in the deployment of the Belarusian national movement, which began as a cultural and ethnographic, in the program provisions of national parties, in the search for forms of national-state construction, taking place in a clash of different views and opinions. The appearance of the Belarusian periodical press, the activities of the BNR government, the proclamation of the BSSR also played a role here. In the 1920s, Belarus acquired the status of a state policy.

**Key words:** policy of Belarusization, Belarusian national movement, periodicals, state policy, national-state construction, Belarusian population.

**Уводзіны.** Беларусізацыя – палітыка нацыянальна-дзяржаўнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва, што праводзілася ў 1920-я гады ў БССР. У сваім асноўным змесце яна з’явілася вынікам разгортвання беларускага нацыянальнага руху, які пачынаўся як культурна-этнаграфічны, калі пераважалі разрозненыя праявы навуковай, літаратурнай, культурна-асветніцкай дзейнасці сярод дробнай шляхты, уніяцкага духавенства, студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага ўніверсітэта па вывучэнні мовы, культуры, звычаяў, гістарычнага мінулага беларусаў. Гэтая дзейнасць была накіравана супраць афіцыйнай палітыкі самадзяржаўя, за змаганне з пагарднымі адносінамі да беларускай мовы, за аднаўленне культурных і гістарычных традыцый беларускага народа, супраціўленне наступствам паланізацыі і русіфікацыі, – усё гэта было своеасаблівым стыхійным пратэстам супраць ігнаравання самабытнасці беларускага этнасу, служыла абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці.

У канцы ХІХ ст. беларускі нацыянальна-вызваленчы рух дасягнуў новай якасці ў дзейнасці групы «Гоман». Беларускія студэнты, што ўваходзілі ў групу, спрабавалі тэарэтычна абгрунтаваць існаванне беларускай нацыі, патрабавалі сацыяльнага і нацыянальнага разняволення беларускага народа, ажыццяўленне якога звязвалі з утварэннем федэрацыі свабодных раўнапраўных аўтаномных абласцей.

**Асноўная частка.** З’яўленне легальных беларускіх газет «Наша доля» і «Наша ніва», якія выступалі за нацыянальнае раўнапраўе беларускага народа, свабоднае развіццё яго культуры, стала буйной заваёвай на шляху росту нацыянальнай самасвядомасці, развіцця духоўнасці беларускага насельніцтва. Тут працавалі В. Ластоўскі, М. Багдановіч, Я. Колас, Я. Купала і іншыя, якія «выраслі ў народзе, ад народа не адарваліся, ім вядомы народныя патрэбы… яны ведаюць народ, і народ ведае іх, – ведае і верыць ім» [1, с. 158]. Дзякуючы працы гэтых людзей ўсё больш шырокія колы грамадства Беларусі разумелі неабходнасць самастойнага развіцця, дзяржаўнага самавызначэння беларускага народа.

У перыяд Першай сусветнай вайны, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый беларуская нацыянальная ідэя была канкрэтызавана ў праграмных палажэннях нацыянальных партый, што актыўна ўключыліся ў барацьбу за стварэнне беларускай дзяржаўнасці. Трэба адзначыць, што пошук форм нацыянальна-дзяржаўнага

будаўніцтва праходзіў у становішчы сутыкнення поглядаў і меркаванняў. Так, кіраўнікі Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) Мяснікоў А., Кнорын В., Ландэр К., Рагазінскі І. і іншыя лічылі, што беларускія губерні павінны ўвайсці ў склад РСФСР як Заходняя вобласць Расіі. Кіраўнік Часовага ўрада Беларусі, сакратар ЦК КП(б)Б Кнорын В., адстойваючы гэтую думку, напіша наступнае: «Мы лічым, што беларусы не з'яляюцца нацыяй, і што тыя этнічныя асаблівасці, якія іх аддзяляюць ад астатніх рускіх, павінны быць забытыя. Нашай задачай з'яўляецца не стварэнне новых нацый, а знішчэнне старых нацыянальных рагатак» [2, с. 13–14].

Такія погляды былі абумоўлены ідэяй адзінай і непадзельнай Расіі, адзінага народа, у склад якога павінны былі ўвайсці ўсе суседнія народы. І зразумела, што пакуль такая думка заставалася пануючай у кіруючых колах, усялякія спробы беларусізацыі былі асуджаны на правал.

Спадзеючыся пабудаваць самастойную Беларусь у згодзе з «Дэкларацыяй правоў народаў Расіі», дзеячы беларускага нацыянальнага руху робяць спробы стварыць свае органы ўлады, якія б абапіраліся на самыя шырокія масы працоўных. У лістападзе 1917 г. выканкамы Вялікай Беларускай Рады, Цэнтральная Белвайскрады выдалі адозву «Да ўсяго народа беларускага», у якой прапанавалі праграму нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. Прадугледжвалася, у прыватнасці, абвяшчэнне Беларусі дэмакратычнай рэспублікай і яе федэрацыя з Расіяй і іншымі суседнімі рэспублікамі, з адпаведным размежаваннем правоў краявых і федэральных улад, перадача ўлады на Беларусі Краёвай радзе; фарміраванне беларускага нацыянальнага войска і інш. Вялікая Беларуская Рада звярталася да ўсяго народа з заклікам узяць у свае рукі кіраванне краем. А для арганізацыі такой улады адозва аб'яўляла скліканне з'езда прадстаўнікоў беларускага народа (Першы Усебеларускі з'езд працаваў у Мінску ў снежні 1917 г.).

Незалежніцкія тэндэнцыі ў беларускім руху ўзмацніліся пасля падпісання Савецкай Расіяй Брэсцкага міру (1918 г.), падзелу Беларусі ў выніку якога завяршылася канчатковае выспяванне і самавыяўленне ідэі суверэннай Беларускай дзяржавы. Зразумела, што дасягнуць рэальнай незалежнасці, калі тэрыторыя краіны знаходзілася пад акупацыяй нямецкіх войскаў, было немагчыма. Тым не менш акупацыйныя ўлады перадалі ў распараджэнне Рады БНР пытанні гандлю, прамысловасці, знешняй палітыкі і культуры.

Адразу ж пасля абвяшчэння БНР Народны сакратарыят прыняў пастанову аб дзяржаўным статусе беларускай мовы. Вельмі важным было адраджэнне беларускай школы (у 1918 г. беларускіх пачатковых школ налічвалася ўжо 350 [3, с. 227]). Адбывалася развіццё сярэдняй і вышэйшай школы. Дзейнічала гімназія ў Слуцку, у Мінску была адчынена Вышэйшая музычная школа (у далейшым пераўтвораная ў Беларускую кансерваторыю), створана камісія па падрыхтоўцы адкрыцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта на чале з М. Доўнар-Запольскім.

Першачарговай задачай была падрыхтоўка педагагічных кадраў для школ.

1 красавіка 1918 г. пачалі дзейнічаць курсы беларусазнаўства, дзе чыталіся лекцыі па гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры, геаграфіі, гісторыі беларускага права, беларускай мове.

Важную ролю ў справе культурнага адраджэння выконваў перыядычны друк. На старонках «Вольнай Беларусі», «Беларускага шляху» і іншых газет і часопісаў, якіх у 1918 г. выходзіла каля 20, адлюстроўваліся найважнейшыя падзеі грамадскага жыцця, друкаваліся творы Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, А. Гаруна, Л. Лёсіка, А. Луцкевіча.

У маі 1917 г. па ініцыятыве А. Лявіцкага было створана Першае Таварыства Беларускай драмы і камедыі, якое ўзначаліў Ф. Ждановіч, і якое праз год было рэарганізавана ў Беларускі дзяржаўны тэатр.

Такім чынам, дзейнасць БНР з'явілася важным этапам культурна-нацыянальнага адраджэння. Бясспрэчны ўклад дзеячоў БНР у развіццё беларускай мовы, культуры, асветы, падрыхтоўку беларускіх нацыянальных кадраў, у фарміраванне нацыянальнай свядомасці беларусаў. Культурная спадчына БНР у значнай сваёй частцы была ўключана ў працэс будаўніцтва Савецкай Беларусі, у палітыку беларусізацыі 1920-х гг., у ажыццяўленні якой самы актыўны ўдзел прымуць былыя дзеячы БНР, такія як М. Доўнар-Запольскі, А. Смоліч, Я. Лёсік, А. Цвікевіч, С. Некрашэвіч.

За межамі Беларусі, на тэрыторыі Расіі значную падрыхтоўчую працу па ўтварэнні Беларускай дзяржавы вёў Беларускі нацыянальны камісарыят пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў РСФСР. Дзейнасць яго пад кіраўніцтвам А. Чарвякова, З. Жылуновіча разгортвалася больш у культурна-асветніцкім і агітацыйным накірунку. Белнацкам разгарнуў актыўную работу сярод беларусаў-бежанцаў, стварыў у іх асяроддзі розныя культурна-асветніцкія ўстановы, клубы, гурткі, курсы (Беларускае навукова-культурнае таварыства, клуб «Беларус» у Маскве, Беларускае вольна-эканамічнае таварыства, «Беларуская хатка» ў Петраградзе).

Па ініцыятыве Белнацкама з ліпеня 1918 г. у Маскве працаваў Беларускі народны ўніверсітэт, заняткі якога наведвалі пераважна школьныя

настаўнікі Беларусі. Была заснавана першая савецкая газета на беларускай мове – «Дзянніца», на старонках якой друкаваліся беларускія мастацкія творы, матэрыялы, якія асвятлялі дзейнасць Белнацкама, дакументы пра палітычную і культурна-асветніцкую работу ўрада БНР.

Пасля ўтварэння Беларуска-Літоўскай рэспублікі ў 1919 г. З. Жылуновіч, А. Чарвякоў і іх прыхільнікі, абураныя абкарнаннем тэрыторыі Беларусі, направілі ў ЦК РКП(б) пісьмо, у якім выказалі пратэст супраць тэрытарыяльнага падзелу рэспублікі, вынікам чаго стала абвінавачваннеіх на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў у несваечасовай пастаноўцы пытання аб утварэнні Беларускай савецкай дзяржаўнасці і выключэнне са складу ўрада БССР.

Аднак абысці, замаўчаць беларускае пытанне ўжо было немагчыма. Гэта добра разумелі і ва ўрадзе Літоўска-Беларускай ССР, пацвярджэннем чаго стаў Дэкрэт аб дзяржаўных мовах, згодна з якім мовы беларуская, літоўская, польская, руская і яўрэйская аб'яўляліся агульнадзяржаўнымі. Тады ж Наркамат асветы прыступіў да беларусізацыі школ.

Пасля паўторнага абвяшчэння ССРБ у ліпені 1920 г. хутка высветлілася, што рэспубліка ўзнаўляецца толькі на базе шасці паветаў Мінскай губерні, і, фактычна, беларусам была прадстаўлена культурна-нацыянальная аўтаномія ў межах гэтай губерні. З гэтага моманту пытанне аб пашырэнні тэрыторыі распублікі становіцца адным з галоўных у дзейнасці камуністаў-беларусаў, дзеячоў культуры і беларускага нацыянальнага руху.

Настойлівыя патрабаванні кіраўніцтва Беларусі вымусілі Прэзідыум ЦВК РСФСР прыняць пастановы (у 1924 г. і ў 1926 г.) аб передачы БССР тэрыторый, дзе пражывала пераважна беларускае насельніцтва (шэраг паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў). У выніку ўзбуйнення тэрыторыя Беларусі перавысіла 125 тыс. км$^2$, на якой жыло каля 5 млн чалавек. Такая колькасць насельніцтва давала ўжо падставы лічыць сябе немалой нацыяй, ставіць перад сабой вялікамаштабныя задачы па эканамічным і культурным развіцці, ад паспяховага рашэння якіх залежаў і рост нацыянальнай свядомасці беларусаў.

Такім чынам, уз'яднанне Беларусі стала адной з галоўных перадумоў беларусізацыі, падмурак якой быў створаны у працэсе разгортвання беларускага нацыянальнага руху. Практычныя вынікі дзейнасці ўрада БНР па культурна-нацыянальным адраджэнні і дзейнасць Белнацкама ў гэтым накірунку фактычна стварылі першапачатковую базу, на аснове якой і будзе разгортвацца беларусізацыя.

У выніку абвяшчэння Беларусі суверэннай дзяржавай адна з асноватворных ідэй нацыянальнага самавызначэння атрымала практычнае ўвасабленне, што адкрыла шырокія магчымасці для самастойнага развіцця народа, яго эканомікі і культуры. Кіраўніцтва БССР разумела, што ўсе праблемы – і эканамічныя, і сацыяльныя, і нацыянальныя – трэба вырашаць у комплексе, паколькі абвастрэнне адных вяло да абвастрэння другіх.

На ўзровень дзяржаўнай палітыка беларусізацыі фактычна была ўзнята пасля рашэнняў X і XII з'ездаў РКП(б) (1921 г., 1923 г.) з дакладным замацаваннем у адпаведных законах. Асноўныя канцэптуальныя падыходы і кірункі гэтай палітыкі былі вызначаны яшчэ беларускім нацыянальным рухам, і многія з ідэй беларусізацыі ўжо тады пачалі ажыццяўляцца.

У снежні 1920 г. па ініцыятыве загадчыка аддзела Наркамата асветы Іллючонка П. былі адкрыты курсы беларусазнаўства для падрыхтоўкі настаўнікаў беларускіх пачатковых школ. Загадчыкам курсаў быў Я. Лёсік, у мінулым адзін з актыўных дзеячоў Беларускай сацыялдэмакратычнай партыі. Пад яго рэдакцыяй у Мінску ў 1917–1918 гг. выходзіла газета «Вольная Беларусь» на беларускай мове, на старонках якой ён выступаў за адраджэнне нацыянальнай свядомасці, роднай мовы і Беларускага краю. Ужо ў 1920-я гг. Я. Лёсік чытаў лекцыі ў БДУ, друкаваўся шмат у якіх часопісах, стаў аўтарам граматыкі і правапісу беларукай мовы («Практычная граматыка беларускай мовы», «Беларуская мова. Правапіс»).

Яшчэ адзін дзеяч гэтай партыі – У. Ігнатоўскі (са снежня 1920 г. – народны камісар асветы БССР) ужо ў канцы 1920-га года прапанаваў перавесці справаводства свайго наркамата на беларускую мову, што ў хуткім часе і было зроблена.

Найбольш далёка ў гэтай справе пайшоў намеснік наркама замежных спраў А. Бурбіс, які стаў ініцыятарам беларусізацыі ў сваім наркамаце. Там ужо ў 1921 г. усё справаводства было пераведзена на беларускую мову.

У лютым 1921 г. на II сесіі ЦВК БССР быў прыняты шэраг пастаноў, якія шмат у чым прадвызначылі ўвесь наступны ход беларусізацыі. Так, быў пацверджаны дэкрэт урада Беларуска-Літоўскай ССР аб раўнапраўі ў якасці дзяржаўных беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай моў, намечаны меры па стварэнні сістэмы дашкольнага выхавання і школьнай адукацыі, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў і тэхнікумаў. Ставіліся практычныя пытанні аб выдавецтве, аб падтрыманні літаратараў і вучоных, што працавалі на мясцовых мовах Беларусі [4, с. 78–79].

Але такія справы былі больш цікавымі эпізодамі, вынікам уласнай ініцыятывы асобных людзей, чым мэтанакіраванай палітыкай

улады на Беларусі. Ва ўмовах савецкай сістэмы, якая характарызавалася выключнай кіруючай пазіцыяй камуністычнай партыі, мясцовыя ініцыятывы толькі тады маглі мець поспех, калі яны адпавядалі канкрэтным цэнтральным партыйным дырэктывам.

Прынцыпы палітыкі беларусізацыі фактычна былі сфармуляваны ў 1923 г. на VII з'ездзе КП(б)Б (у сакавіку) і на пленуме ЦБ КП(б)Б (у ліпені), дзе вызначаўся комплекс мер па гаспадарчым адраджэнні краю, тэрытарыяльным самавызначэнні беларускага народа, развіцці беларускай мовы і нацыянальнай культуры, вылучэнні і выхаванні кадраў партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага апаратаў, што адкрывала шырокія магчымасці для ажыццяўлення ідэй беларускага адраджэння.

Пры распрацоўцы і ажыццяўленні беларусізацыі неабходна было ўлічваць шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі, яго своеасаблівае рассяленне на тэрыторыі рэспублікі. Па перапісе 1926 г. доля беларусаў складала 80,6%, яўрэяў – 8,2%, рускіх – 7,7%, палякаў – 2%, украінцаў – 0,7% і інш. [5, с. 60]. Трэба было ўлічваць і тое, што беларусы галоўным чынам пражывалі ў вёсках, яўрэі, у сілу існаваўшай пры царызме рысы аселасці, – у мястэчках і гарадах і складалі часам да 40–60% колькасці іх жыхароў. У гарадах у большасці пражывалі і рускія, хаця нямала іх было і ў сёлах. Астатнія нацыянальныя меншасці жылі як у гарадах, так і ў вёсках, утвараючы нярэдка даволі кампактныя групы.

Такое рассяленне стварала свайго роду нацыянальны разрыў паміж горадам і вёскай, а таксама ўносіла спецыфіку ў моўнае становішча – рускамоўны горад і беларускамоўная вёска.

Неабходна адзначыць таксама нізкі эканамічны ўзровень развіцця Беларусі, павялічаны вайной і разрухай, якому спадарожнічаў жабрацкі ўзровень дабрабыту народа. Гаспадарчая адсталасць Беларусі і русіфікатарская палітыка царскага ўрада адбілася на культурным развіцці беларусаў. Падняць культурны ўзровень жыцця, а тым самым павысіць сацыяльную актыўнасць насельніцтва было адной з асноўных задач нацыянальнай палітыкі.

Яшчэ адной асаблівасцю ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі на Беларусі была непрапарцыянальна нізкая доля беларусаў у партыйных, савецкіх, гаспадарчых органах улады і кіравання, што па-свойму ўскладняла выпрацоўку і правядзенне нацыянальнай палітыкі. Беларусізацыя пачыналася тады, калі гэтая доля не дасягала і паловы. Такія суадносіны ў кіруючых органах тлумачацца ў першую чаргу тым, што яўрэі і рускія, якія пражывалі ў асноўным у гарадах і мястэчках, мелі больш магчымасцей атрымліваць добрую адукацыю. Невыпадкова паводле перапісу 1926 г. самая значная колькасць пісьменных сярод розных нацыянальнасцей Беларусі была ў яўрэяў – 70%, трохі менш у палякаў і рускіх – 50% і 49% адпаведна, у беларусаў – 36% [6, с. 60–61]. Пры распрацоўцы палітыкі беларусізацыі на кадравае пытанне будзе звернута асаблівая ўвага.

Афіцыйны статус дзяржаўнай палітыка беларусізацыі атрымала з прыняццем на II сесіі ЦВК БССР (у ліпені 1924 г.) пастановы «Аб практычных мерапрыемствах па правядзенні нацыянальнай палітыкі», згодна з якой раўнапраўнымі на тэрыторыі Беларусі абвяшчаліся беларуская, руская, яўрэйская і польская мовы [7, с. 7–8]. Да гэтага часу на Беларусі ўжывалася пераважна руская мова. Беларуская мова выконвала мізэрны аб'ём сацыяльных функцый, нягледзячы на тое, што карэннае насельніцтва складала 80%. Для ўжывання яўрэйскай і польскай моў таксама не знаходзілася месца ў грамадскім жыцці, хаця на іх носьбітаў прыпадаў значны працэнт у агульным складзе насельніцтва Беларусі.

Палітыка беларусізацыі складалася з дзвюх узаемазалежных частак – нацыяналізацыі і карэнізацыі. Першая азначала шырокае развіццё беларускай культуры (школы, ВНУ на беларускай мове, выданне кніг, навукова-даследчая работа па ўсебаковым вывучэнні Беларусі і г. д.), увядзенне беларускай мовы практычна ў кожную галіну грамадска-палітычнага і эканамічнага жыцця (перавод на беларускую мову партыйнага, дзяржаўнага, прафсаюзнага, кааператыўнага апаратаў і часцей Чырвонай арміі). А другая – вылучэнне прадстаўнікоў карэннага насельніцтва на партыйную, савецкую, прафсаюзную і грамадскую работу, прычым такое вылучэнне адбывалася не па нацыянальнай прыкмеце (беларус – не беларус), а па дзелавых якасцях, веданні ўмоў і асаблівацей Беларусі, дасканальным валоданні беларускай і рускай мовамі. Адсюль і назва гэтага накірунку – карэнізацыя, якая датычылася не толькі беларусаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Яшчэ адна характэрная рыса беларусізацыі – тое, што не засталіся без увагі інтарэсы тых нацыянальных меншасцей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі. Іх патрэбам надавалася значная ўвага ў шматлікіх пастановах і рашэннях, што прымаліся адносна беларусізацыі. Беларускія нацыянальна-дэмакратычныя дзеячы, у т. л. і савецкага перыяду, добра разумелі, што поспехі на шляху нацянальнага адраджэння будуць залежаць ад таго, як успрымуць палітыку беларусізацыі іншыя этнічныя супольнасці Беларусі: не можа быць свабоднай і паважанай нацыя, якая сама не паважае правоў іншых народаў, тым больш калі апошнія з'яляюцца нацыянальнымі меншасцямі. Адносіны да іх мовы і культуры былі аналагічнымі адносінам да беларускай мовы

і культуры. Іх развіццё падтрымлівалася, забяспечвалася матэрыяльна і арганізацыйна. І дзякуючы гэтаму некарэннае насельніцтва ў аснове сваёй прыхільна ставілася да беларусізацыі.

**Заключэнне.** На працягу 1924–1925 гг. распрацоўка праграмы беларусізацыі ў цэлым была завершана. У далейшым яна неаднарозова ўдакладнялася і дапаўнялася. Але асновы беларусізацыі, яе галоўныя напрамкі былі распрацаваны да 1925 г. Гэты першы этап беларусізацыі амаль цалкам быў адданы ідэалагічнай падрыхтоўцы, тлумачэнню ў шырокіх колах насельніцтва мэтаў і задач беларусізацыі.

У гэты час праз газеты і часопісы даволі абгрунтавана і канкрэтна тлумачылася неабходнасць беларусізацыі. Каб лепш падрыхтаваць разнамоўных людзей да гэтай падзеі, у рускіх перыядычных выданнях, якія павінны былі перайсці на беларускую мову, напрыклад, загадзя пачалі друкаваць на ёй матэрыялы, каб людзі паступова авалодвалі родным словам карэннага насельніцтва.

Такім чынам, палітыка беларусізацыі была добра распрацавана і разлічана на доўгі перыяд. Маючы сваёй мэтай развіццё беларускай культуры, адраджэнне нацыянальнай мовы, яна стала вызначальнай рысай усяго грамадскага развіцця БССР 1920-х гг. У яе ажыццяўленні ўдзельнічалі тысячы людзей: партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных дзеячаў, настаўнікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Беларусізацыя дала вялікую надзею на рэалізацыю ідэй нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якія ў другой палове 1920-х гг. знайшлі сваё ўвасабленне на практыцы.

## Літаратура


1. Лыч Л. Беларуская нацыя і мова. Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. 227 с.
2. Асіноўскі С. Кнорын: «Мы лічым, што беларусы не з'яўляюцца нацыяй…» // Беларуская мінуўшчына. 1995. № 4. С. 12–15.
3. Мазец В. За сваё кроўнае // Маладосць. 1994. № 5. С. 224–231.
4. Чарвякоў А. За Савецкую Беларусь. Мінск: Беларускае выд-ва, 1927. 137 с.
5. Будзін Ш. А. Нацыянальнае пытанне. Мінск: Дзяржаўнае выд-ва Беларусі, 1932. 392 с.
6. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальнаму пытанню. Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1929. 167 с.
7. Практычнае вырашэнне нацыянальнага пытання ў БССР: у 2 ч. Мінск: Выд-ва Нацкамісіі ЦВК БССР, 1928. Ч. 1: Беларусізацыя. 152 с.


## References


1. Lych L. *Belaruskaya natsyya i mova* [Belarusian nation and language]. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1994. 227 p.
2. Asinouski S. Knorin: "We believe that the Belarusians do not zyavdyayutstsa nation...". *Belaruskaya minuushchyna* [Belarusian history], 1995, no. 4. pp. 12–15 (In Belarusian).
3. Mazets V. During his blood. *Maladosts'* [Youth. Number], 1994, no. 5, pp. 224–231 (In Belarusian).
4. Charvyakou A. *Za Savetskuyu Belarus'* [For Soviet Belarus]. Minsk, Belaruskaye vydavetstva Publ., 1927. 137 p.
5. Budzin Sh. A. *Natsyyanal'naye pytanne* [The national question]. Minsk, Dzyarzhaunaye vydavetstva Belarusi Publ., 1932. 392 p.
6. *Dva gady natsyyanal'nay raboty u BSSR: zbor pramou, artykulau i rezalyutsyy pa natsyyanal'namu pytanny* [Two years of national work in the BSSR: the collection of speeches, articles and resolutions on the national question]. Minsk, Vydavetstva Natskamisii TsVK BSSR Publ., 1929. 167 p.
7. *Praktychnaye vyrashenne natsyyanal'naga pytannya u BSSR. U 2 ch. Ch. 1. Belarusizatsyya* [The practical solution of the national question in the Byelorussian SSR. In 2 parts. Part 1. Belarusization]. Minsk, Vydavetstva Natskamisii TsVK BSSR Publ., 1928. 152 p.


## Інфармацыя пра аўтара


**Каляда Іна Уладзіміраўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь).


## Information about the author


**Kolyada Ina Uladzimirauna** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus).


*Паступіў 12.03.2019*